# Мінскія партызаны ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі

## В. КАЗЛОЎ

З першых дзён нападзення нямецка-фашысцкіх разбойнікаў на Совецкі Саюз беларускі народ разам з усімі народамі вялікага Совецкага Саюза па закліку вялікага Сталіна выступіў са зброяй у руках на абарону сваёй любімай радзімы.

Разлікі крывавых нямецкіх драпежнікаў на вялікую здабычу матэрыяльных каштоўнасцей у Беларусі, на адрыў беларускага народа ад вялікага рускага народа не апраўдаліся. Замест матэрыяльных багацця і падтрымання з боку мясцовага насельніцтва фашысцкія прыгнятальнікі атрымалі ўсеагульную нянавісць і партызанскую вайну.

3 ліпеня 1941 года у сваёй гістарычнай прамове па радыё таварыш Сталін з поўнай яснасцю ўказаў совецкаму народу адзіна правільны шлях перамогі над ворагам, вызначыў баявую праграму дзеянняў працоўных у барацьбе супроць фашысцкіх захопнікаў.

«У занятых ворагам раёнах,— указваў таварыш Сталін,— трэба ствараць партызанскія атрады, конныя і пешыя, ствараць дыверсійныя групы для барацьбы з часцямі варожай арміі, для распальвання партызанскай вайны скрозь і ўсюды, для ўзрыву мастоў, дарог, псавання тэлефоннай і тэлеграфнай сувязі, падпальвання лясоў, складаў, абозаў. У захопленых раёнах ствараць нязносныя ўмовы для ворага і ўсіх яго пасобнікаў, праследваць і знішчаць іх на кожным кроку, зрываць усе іх мерапрыемствы» [1].

Беларускі народ горача адгукнуўся на заклік правадыра. Ва ўсю шырыню разгарнуўся партызанскі рух — ён стаў масавым усенародным рухам.

Беларускі народ упісаў не адну гераічную старонку ў гісторыю барацьбы супроць нямецкіх захопнікаў. Бязлітасная партызанская вайна з фашысцкімі прыгнятальнікамі, якая разгарнулася ў Беларусі ў тылу ворага, праводзілася з дня ў дзень усё з нарастаючай магутнасцю і з'явілася вельмі сур'ёзнай сілай у дапамозе Совецкай Арміі па разгрому ворага.

У Беларусі дзейнічалі дзесяткі партызанскіх брыгад, сотні партызанскіх атрадаў, налічваўшых у сваіх радах больш 300 тысяч партызан, у тым ліку 50 тысяч жанчын.

На працягу трох гадоў беларускія партызаны ў смяртэльнай барацьбе супроць нямецкіх захопнікаў знішчылі тысячы салдат, афіцэраў і генералаў, грамілі штабы і камунікацыі, садзейнічалі зрыву важнейшых ваенных, палітычных і гаспадарчых мерапрыемстваў ворага, выратоўвалі насельніцтва ад знішчэння і ўгону на нямецкую катаргу.

Гітлераўскія разбойнікі самі прымушаны былі прызнаць, што Беларусь з'яўляецца вялікай пагрозай ажыццяўленню іх планаў.

У пісьме да міністра акупіраваных раёнаў, Розенберга, рэдактар адной нямецкай газеты ад 30 мая 1942 года паведамляў:

«Сёння партызанская вайна ахоплівае ўсю Беларусь, амаль усе лясы запоўнены імі. Некаторыя часткі раёнаў знаходзяцца ў іх уладзе. Нападзенню падвяргаюцца цэлыя гарады. Нападаюць на нямецкія ваенныя атрады і на грамадзянскія ўпраўленні, праводзяць мітынгі сярод аседлага насельніцтва. Партызанская вайна імкнецца ператварыцца ў тылавы фронт нямецкай арміі».

---

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Партызанская вайна ў Беларусі разам з партызанскай вайной іншых абласцей сапраўды была тылавым фронтам нямецкай арміі.

* * *

Мінскія партызаны займалі адно з выдатных месц ў слаўных радах беларускіх народных мсціўцаў. Мінская вобласць была акупіравана нямецка-фашысцкімі захопнікамі ў першы месяц вайны. Аднак можна сказаць без усякага пераўвелічэння, што немцы ніколі не былі поўнымі і сапраўднымі гаспадарамі на тэрыторыі вобласці. І гэта не словы, а жывая сапраўднасць. Больш чым тры чвэрці вобласці знаходзілася пад кантролем партызан. Ва ўсіх раёнах вобласці актыўна дзейнічалі бальшэвіцкія падпольныя арганізацыі.

Але дабіцца гэтага было не так лёгка. Вядома, што ход падзей на франтах у першыя дні Вялікай Айчыннай вайны не даў нам часу на тое, каб загадзя расставіць людзей і правесці падрыхтоўчую работу. Падпольныя партыйныя арганізацыі прыходзілася ствараць ужо ва ўмовах поўнай акупацыі вобласці, у складанай і цяжкай абстаноўцы.

У нас не было яшчэ практычнага вопыту ў той час, але затое перад намі асабліва выразна прадсталі слаўныя традыцыі бальшэвіцкай партыі, бяссмертныя ўказанні і парады, якія даваў Ленін звыш сарака гадоў таму назад аб стварэнні падпольных арганізацый, аб пастаноўцы канспірацыі, падзеле працы паміж падпольшчыкамі і т. д.

Следуючы гэтым бяссмертным заветам В. І. Леніна і ўказанням таварыша Сталіна, Мінскі абласны камітэт партыі з першых дзён акупацыі Мінска і Мінскай вобласці перайшоў з легальных умоў у глыбокае падполле. Першая задача, якую абком партыі паставіў перад сабой, было стварэнне партыйных цэнтраў у раёнах і ўстанаўленне сувязі з імі.

Размеркаваўшы раёны дзейнасці паміж кіруючымі абласнымі работнікамі, абкомаўцы неадкладна накіраваліся ў вызначаныя пункты. Пры кожным работніку абкома партыі меліся тры звязных, праз якіх ішла інфармацыя аб тым, дзе, у якіх месцах знаходзяцца работнікі абкома, якая праведзена работа, у які раён накіроўваецца работнік, што на яго думку трэба было-б зрабіць і т. д.

У большасці раёнаў вобласці кіруючыя работнікі—сакратары і загадчыкі аддзеламі райкомаў, старшыні і загадчыкі аддзеламі райвыканкомаў, сакратары пярвічных партарганізацый, старшыні сельскіх советаў—пайшлі ў лясы. Ва многіх раёнах з першых-жа дзён акупацыі ўзніклі невялікія партызанскія атрады.

Арганізацыйная работа заняла, прыкладна, тры месяцы, За гэты час ў большай частцы раёнаў былі створаны падпольныя раённыя камітэты партыі і партыйныя цэнтры зон. Людзі былі праінструктаваны. Былі ўстаноўлены формы сувязі. Будуючы партыйнае падполле, абласны камітэт і раённыя камітэты партыі сканцэнтроўвалі ўвагу і сілы на разгортванні партызанскага руху. У гарадах і сёлах, у пасёлках ствараліся ініцыятыўныя групы з комуністаў, комсамольцаў, беспартыйных актывістаў—сялян, рабочых і служачых—колькасцю па 5—7 чалавек. Яны станавіліся ядром партызанскіх атрадаў, якія потым ператварыліся ў шматлікую армію народных мсціўцаў. Такім чынам было створана 183 партызанскіх атрады з 83.186 чалавек.

У радах мінскіх партызан дзейнічалі дзесяткі тысяч моладзі. Было створана 429 пярвічных комсамольскіх арганізацый у атрадах, якія налічвалі 8.675 членаў ЛКСМБ і 536 падпольных пярвічных арганізацый у гарадах і сёлах вобласці, у якіх састаяла 3.377 комсамольцаў.

Самым цяжкім пытаннем, якое ўзнікала ў сувязі з арганізацыяй партызанскіх атрадаў, было пытанне аб узбраенні партызан. З кожным днём атрады разрасталіся, папаўняліся новымі байцамі, партызанскі рух набываў масавы ўсенародны характар. Тады яшчэ атрады не мелі магчымасці ўзброіць усіх сваіх байцоў. Але і тут выхад быў знойдзен самімі партызанамі.

На тэрыторыі Мінскай і суседніх абласцей у час адступлення часцей Совецкай

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Арміі ішлі вялікія баі. Па ініцыятыве камуністаў і камсамольцаў пачалі стварацца групы па збору зброі і боепрыпасаў па палях нядаўніх бітваў. Гэтыя групы збіралі сотні вінтовак, аўтаматаў, гранат, дзесяткі тысяч патронаў. Прыходзілася ісці на розную хітрасць, каб даставіць зброю па прызначэнню — у партызанскія атрады. І нярэдка можна было бачыць такую карціну. Селянін вязе воз сена. На руках у яго паперка старасты аб тым, што сена адпраўляецца на прыёмачны пункт. Але замест прыёмачнага пункта селянін заварачвае ў лес і аднаму яму вядомымі шляхамі прабіраецца да партызанскай стаянкі. Там воз сена разгружаўся і атрад атрымліваў некалькі дзесяткаў вінтовак і 2—3 скрынкі з патронамі.

Былі і іншыя спосабы ўзбраення. Зброю набывалі шляхам нападзення на склады праціўніка, на нямецкія гарнізоны ў населеных пунктах, на рухомыя калоны варожых аўтамашын, нагружаных зброяй і боепрыпасамі. Многа зброі партызаны атрымалі ад насельніцтва гарадоў і вёсак. Партызанская брыгада імя Чкалава толькі ў першыя месяцы свайго існавання атрымала ад сялян звыш 200 вінтовак і аўтаматаў, 14 кулямётаў, больш 10 тысяч патронаў.

Пасля-ж, калі ў партызанскім руху сталі прымаць удзел дзесяткі тысяч людзей, у атрадах паявіліся і свае спецыялісты—майстры па вырабу зброі і іншых сродкаў барацьбы з праціўнікам. У чатырох раёнах былі арганізаваны майстэрні па рамонту і вытворчасці зброі.

Насельніцтва прывозіла і прыносіла ў атрады часткі вінтовак, кулямётаў, мінамётаў, аўтаматаў, часткі гармат, шмат металу. Пры дапамозе прымітыўных станкоў вытвараліся нехапаючыя часткі. Умелыя рукі партызанскіх майстроў—былых калгасных кавалёў і слесараў МТС—аднавілі сотні вінтовак, кулямётаў, аўтаматаў.

У радзе партызанскіх атрадаў была разгорнута вынаходніцкая і канструктарская работа. Так вынайдзены былі інжынерам Шавгулідзе ручныя гранаты чатырох канструкцый, атрымаўшыя назву «партызанская граната», якія далі цудоўныя вынікі ў баях. Выпускаліся ўласна партызанскія міны, снарады, патроны і т. п., якія шырока ўжываліся мінскімі партызанамі ў баявых аперацыях. У брыгадах аднаго партызанскага з'яднання на працягу месяца выраблялася сваімі сіламі 26 аўтаматаў і больш тысячы штук ручных гранат партызанскай вытворчасці. Найлепшыя водзывы партызан атрымаў станок канструкцыі інжынера—сакратара ЦК КП(б)Б тав. П. К. Панамарэнка на перапрацоўку трафейных патронаў пад абразцы нашай зброі. Гэты станок дапамог партызанам вырашыць праблему з патронамі.

Экспанаты мін, снарадаў партызанскіх гранат розных канструкцый і сістэм, вынайдзеных партызанамі Міншчыны, шырока прадстаўлены ў беларускім музеі Вялікай Айчыннай вайны.

* * *

Самай цяжкай у жыцці партызан Міншчыны была зіма 1941 года. Сталых і добра абсталяваных баз партызаны тады яшчэ не мелі. А халады былі суровыя, марозы даходзілі да 40 градусаў. Немцы размясцілі свае гарнізоны ў гарадах, раённых цэнтрах, у найбольш буйных сёлах і аб'явілі насельніцтву, што партызаны перамёрзнуць і памруць з голаду ў лясах.

Заставацца на зіму ў лясах невялікім, разрозненым атрадам, не маючым дастатковай колькасці прадуктаў харчавання, было вельмі небяспечна. Тады пры дапамозе арганізаванага па ўказанню абкома КП(б)Б санпага транспарта ў 1000 павозак многія атрады былі аб'еднаны і пушчаны ў рэйд па раёнах вобласці.

Па дарозе партызаны грамілі нямецкія гарнізоны і наводзілі паніку на ворага. Страх, наганяемы імі на немцаў, быў такі вялікі, што гітлераўцы спачатку лічылі ўдзельнікаў рэйда прарваўшыміся ў тыл часцямі Савецкай Арміі. Такім чынам партызаны дзейнічалі каля чатырох месяцаў.

Гэты слаўны рэйд мінскіх партызан на санках, калі яны арганізаванымі калонамі праехалі ў некалькіх напрамках праз раёны Мінскай, Магілеўскай, Палескай і Баранавіцкай абласцей, вельмі моцна ўстрывожыў нямецкае камандаванне. У радзе месц у Слуцкім, Старобінскім, Глускім, Ганцэвіцкім, Жыткавіцкім, Кіраўскім, Лепін-

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

скім і іншых раёнах немцы з перапалоху пакідалі свае гарнізоны, перадаючы па начальству, што Савецкая Армія прарвала фронт.

За гэты час падпольная партыйная арганізацыя вобласці вельмі значна ўмацавала свае сувязі з насельніцтвам. Народ убачыў, што партызаны дзейнічаюць і громяць ворага. Зімовы рэйд заклаў моцны фундамент для велізарнага росту партызанскага руху. Усё дарослае насельніцтва вёскі Жэвань, Любаньскага раёна, на чале з старшынёй калгаса комуністам тав. Плышэўскім уступіла ў атрад, жыхары вёскі Доўгае, Старобінскага раёна ўступілі ў партызанскі атрад на чале з комуністамі пярвічнай партарганізацыі пры сельсовеце. Кіраўніком атрада стаў сакратар партарганізацыі Гаўрыіл Сцешыц. Вёскі Пасека і Прусы, Старадарожскага раёна, сталі поўнасцю партызанскімі. На чале гэтых двух атрадаў сталі верныя сыны большэвіцкай партыі тт. Петрушэня і Шуба. Такое-ж становішча было і ў радзе іншых месц.

Зімовы рэйд таксама паказаў высокі патрыятызм беларускага народа і любоў мясцовага насельніцтва да партызан, да большэвіцкай партыі. У кожным сяле партызан забяспечвалі хлебам, мясам, бульбай, вопраткай і абуткам.

* * *

Вясной 1942 года партызанскі рух на тэрыторыі Мінскай вобласці пачаў прымаць яшчэ больш шырокі размах. К гэтаму часу падпольныя партыйныя арганізацыі накапілі яшчэ большы вопыт, узраслі іх сувязі з насельніцтвам. Вялікую ролю ў развіцці партызанскай барацьбы адыграла наяўнасць кадраў, здольных арганізаваць насельніцтва і кваліфікавана кіраваць атрадамі. У асяроддзі партызан былі людзі розных прафесій і адукацыі. Побач з калгаснікамі і рабочымі можна было ўбачыць настаўнікаў, аграномаў партыйных і савецкіх работнікаў, людзей навукі. У камандным складзе партызанскіх атрадаў Мінскай вобласці налічвалася 78 процантаў членаў і кандыдатаў партыі. Каля 10 працэнтаў камандзіраў мелі вышэйшую адукацыю і амаль палова — сярэднюю.

Цяжкасці партызанскай барацьбы загартоўвалі людзей, узбагачалі іх вялікім вопытам. У шматлікіх баях з праціўнікам, у абстаноўцы паходнага жыцця, поўнага небяспек, розных нястач і нечаканасцей развіваліся такія рысы нашых людзей, як смякалка, прадпрыймальнасць, гатоўнасць ісці на рызыку, вынаходлівасць. Гэта можна прасачыць на шматлікіх баявых эпізодах, якімі напоўнены партызанскія будні. Гэтыя-ж рысы праяўляюцца ў той рознабаковай палітычнай рабоце, якую вялі партыйныя арганізацыі і партызанскія атрады сярод насельніцтва.

Барацьба беларускіх партызан штодзённа направлялася таварышам Сталіным. Ён цікавіўся ўсімі бакамі партызанскага руху, даваў канкрэтныя ўказанні як лепш арганізаваць барацьбу ў тылу ворага, спалучаць удары партызан з ударамі Савецкай Арміі.

Выключна велізарнае значэнне ў справе разгортвання масавага партызанскага руху ў Беларусі мелі ўказанні таварыша Сталіна, дадзеныя ім у лістападзе 1942 года напярэдадні славутага наступлення Савецкай Арміі пад Сталінградам, калі таварыш Сталін выклікаў да сябе кіраўнікоў беларускіх партызан і пасля дэталёвага азнаямлення са становішчам партызанскага руху ў Беларусі, даў канкрэтную праграму дзеянняў, што і як трэба зрабіць, каб удары, наносімыя па ворагу з тыла былі яшчэ мацней, каб зрабіць партызанскі рух масавым, усенародным.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы